# Андрэй Іванавіч Валынец

Андрэй Іванавіч Валынец – удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, легендарны камбрыг, Герой Савецкага Саюза. У перыяд акупацыі Беларусі гітлераўскімі войскамі кіраваў стварэннем антыфашысцкіх падпольных арганізацый у Куранецкім, Смаргонскім і Маладзечанскім раёнах. Нарадзіўся Андрэй Іванавіч у вёсцы Жаўткі Вілейскага раёна Мінскай вобласці 19 студзеня 1904 года.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, усе стваральныя планы прыйшлося адкласці. Валынец застаўся ў акупіраванай Вілейцы, разам з маленькім сынам пайшоў у партызаны і стаў падымаць патрыётаў на барацьбу з ворагам. Асцярожна падшукваючы аднадумцаў, стварыў антыфашысцкую патрыятычную групу. Баявыя таварышы аднадушна выбралі яго камандзірам.

Добра валодаючы метадамі канспірацыі, Андрэй Валынец адначасова вёў нелегальную працу, дапамагаў мясцовым актывістам ствараць у населеных пунктах падпольныя групы.

Восенню 1941 года атрад Андрэя Валынца пачаў адлік сваіх баявых аперацый. Народныя мсціўцы нападалі на паліцэйскія пасты, знішчалі тэлефонна-тэлеграфныя лініі, пускалі пад адкос фашысцкія эшалоны. Усталяваўшы цесную сувязь з Вілейска-Куранецкім падполлем, партызаны правялі першую сумесную аперацыю – падпалілі ў ліпені 1942 года драўляны мост праз Вілію,

6 чэрвеня 1944 года атрад быў рэарганізаваны ў брыгаду “За Савецкую Беларусь”. У момант аб’яднання з Чырвонай Арміяй у брыгадзе было 410 партызанаў, у актыве – сотнібаявых аперацый. На ліку самога камбрыга 74 баі, 59 дыверсій, 9 пушчаных пад адкос эшалонаў, 18 падарваных аўтамашын праціўніка, а таксама вызваленне вёсак Калавічы, Порса і Бараўцы.

15 жніўня 1944 года “за асобыя заслугі ў развіцці партызанскага руху ў Беларусі, узорнае выкананне ўрадавых заданняў у барацьбе супраць гітлераўскіх захопнікаў, за адвагу і мужнасць Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР” Андрэю Іванавічу Валынцу бало прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, 16 верасня 1944 года Герой Савецкага Саюза атрымаў ад Міхаіла Калініна залатую зорку Героя. Валынец узнагароджаны таксама ордэнам Леніна і медалямі.

Пасля вайна быломy камандзіру партызанскай брыгады даверылі аднаўленне народнай гаспадаркі ў родных мясцінах. Спачатку ён працаваў старшынёй Вілейскага гарвыканкама, затым займаў адказныя пасады ў Вілейскім, Маладзечанскім райвыканкамах і аблвыканкаме. На жаль, здароўе ветэрана было падарвана перанесенымі выпрабаваннямі. Раптоўна памёр 25-гадовы сын Мікалай, які ваяваў поплеч з бацькам у партызанскім атрадзе, а 30 сакавіка не стала і самога камбрыга.

У Вілейцы і Маладзечна ў гонар Андрэя Іванавіча Валынца названы вуліцы. У Маладзечна ўсталяваны помнік герою. У Вілейскім краязнаўчым музеі і ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі, які знаходзіцца ў горадзе Маладзечна, яму прысвечаны стэнды.